архаизмами. Такие лексемы исторически сохраняются в составе пословиц и поговорок с устаревшим лексическим значением, а в современном русском языке они приобрели другую семантику. Для выполнения данного задания предлагаются паремии: «*Лучше есть смерть паче живота горька*» [1, с. 403]; «*Доля есть, да воли нет*» [1, с. 109].

Таким образом, обращение к текстам пословиц и поговорок в процессе преподавания русского языка будет повышать интерес к изучению языка, способствовать увеличению словарного запаса обучающихся, улучшать навыки культуры речи, а также повысит интерес к изучению лингвистических дисциплин.

**Литература**

1 Снегирев, И. М. Русские народные пословицы и притчи / И. М. Снегирев ; отв. ред. О. А. Платонов. – Москва : Институт русской цивилизации, 2014. – 528 с.

***А. С. Дзядкова***
*Навук. кір.* ***А. А. Станкевіч,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## РЫТАРЫЧНЫЯ ФІГУРЫ Ў ПАЭЗІІ НІЛА ГІЛЕВІЧА

Рытарычныя фігуры з’яўляюцца адным з актыўных сродкаў стварэння слоўнай вобразнасці ў паэтычным дыскурсе. *Рытарычны вокліч* – сцвярджэнне пэўнага паняцця ў эмацыянальнай форме [1, с. 149], пры дапамозе якога аўтар дэманструе пачуцці: здзіўленне, захапленне, радасць, адабрэнне, крыўду і іншыя. Рытарычны вокліч у вершах Н. Гілевіча часта выражае аўтарскае здзіўленне: *“Во, дзівакі! Ой, дзівакі! // Ну проста смех, дый годзе!”* [2, с. 44]; адносіны да пэўных з’яў ці падзей: *“Якое паскудства, якая брыда! // Каб нават на дне акіяну // І ўсюды на свеце прапала вада – // Брыду гэту піць я не стану!”* [2, с. 26]; захапленне якой-небудзь асобай або прадметам: *“А й прыгажуня ж гэта Мінка! // Як ёй да твару ленты, блузка!..”* [3, с. 189].

*Рытарычны зварот* – заклік, словы, з якімі гаворачы звяртаецца да асоб ці прадметаў (прысутных і адсутных) і якія не патрабуюць непасрэднага водгуку [1, с. 149]. Рытарычны зварот у вершах Н. Гілевіча выяўляе аўтарскае стаўленне да прадмета ці асобы: *“Родны край Беларусі, // Ты мне любы да болю!”* [3, с. 32]; *“Паклон табе, родная, нізкі ад сына!”* [3, с. 45]. *Рытарычнае пытанне* – пытальны сказ са сцвярджальным зместам, які не патрабуе адказу [1, с. 150]. Пры дапамозе рытарычных пытанняў аўтар выяўляе здагадку аб пэўных падзеях: *“Часта думаю: // Што, каб не матчына песня? // Чым бы дыхаў? // На холадзе чым саграваўся б?”* [3, с. 215]; падкрэсліваць патрэбную думку: *“Калі ж, калі, вялікі род людскі, // Ты станеш жыць без войнаў і забойстваў?”* [3, с. 229].

Такім чынам, рытарычныя фігуры ў вершах Ніла Гілевіча з’яўляюцца дзейсным сродкам стварэння экспрэсіўнасці яго паэтычнага маўлення.

**Літаратура**

1 Станкевіч, А. А. Лінгвістычны аналіз тэксту : вучэбны дапаможнік / А. А. Станкевіч; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Францыска Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2018. – 198 с.

2 Гілевіч, Н. Збор твораў: у 6 т. / Н. Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1996–2006. – Т. 4 : Сатыра і гумар 1948–2003. – 2003. – 334 с.

3 Гілевіч, Н. Выбраныя творы: у 2 т. / Н. Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1991. – Т. 1 : Вершы, паэмы, п’есы. – 478 с.